***Ючкавіч Марыя***

# Свяці нам, Зорка Віфлеема!

## Сцэнарый каляднай пастаноўкі

*Дзейныя асобы:*

Брат.

Сястра.

Тры сяброўкі.

Вядучы.

Два вучні-чытальнікі.

Анёл.

Тры пастушкі.

Тры каралі.

Цар Ірад.

Тры Сняжынкі.

### Дзея першая

*Дзеянне адбываецца ў пакоі. Хлопчык сядзіць за сталом і нешта малюе. Яго сястра прымярае плацце. Яе выгляд незадаволены.*

*Заходзяць тры сяброўкі.*

**1-я сяброўка:** Хадзем на школьны вечар,
Каляды святкаваць.
Ўсе рады мы сустрэчы
І рады аддаваць…

**2-я сяброўка** (*працягвае*): Пашану немаўляці,
Што нам Пан Бог паслаў.
Сядзець нявартa ў хаце,

Бо Езус завітаў…

**3-я сяброўка** (*заканчвае*):

Да нас у вечар зімні
Нас збавіць ад граху.
Мы радасна павінны
Спяваць Яму хвалу.

**Сястра:** Я, канешне, святу рада,
Ды ў чым сустрэну я Каляды,
Святочны вечар праведу?
Усе уборы ці нарады
Наводзяць на мяне нуду.
Усё нямоднае, старое
І пахне нафталінам!
Няўжо з-за гэтых маіх строяў
Я дома быць павінна?

**Адна з сябровак:** Не, не, ты будзеш разам з намі
У школе свята сустракаць,
Спяваць калядкі і з сябрамі
Малога Езуса ўслаўляць,
Бо для Яго зусім няважна
Ці бедны, ці багаты ўбор.
Ён нарадзіўся бедна, ў стайні,
А варты Неба, варты Зор!

**Сястра:** І сапраўды, маё убранне —
Гэта такая драбяза!
Важней жа з Езусам спатканне.
Што я магу яшчэ сказаць?

**Хлопчык** (*разглядае малюнак, гаворыць задуменна*):

Вось калі б жыў я ў той час,
Як Езус нарадзіўся,

Малюнак для Яго б прыпас.

Напэўна б, Ён здзівіўся,

Пазнаўшы самаго Сябе

І Юзафа, Марыю?!

А так — малюю сам сабе…

Хіба калі адкрыю

Вось гэты свой альбом стары

Ды сам паразглядаю…

**Сястра:** Не, ты малюнак падары,

Бо Езус навучае:

— Што добрае каму зрабіў,

Усё роўна як бы Мне,

Сасмаглага ты напаіў —

Як быццам бы Мяне.

**Брат:** Так, так, я сябру падару

Малюнак гэты свой.

Яго з сабою я бяру.

Вось Езус мой, са мной!

**Адна з сябровак:** Давайце пойдзем да сяброў!

Хутчэй, каб не спазніцца!

Збавіцель наш сягоння зноў

Павінен нарадзіцца!

## Дзея другая

*Адбываецца ў школе.*

**Вядучы:** Пачынаем наша прадстаўленне

Да Нараджэння Езуса Хрыста,

Які нам падарыў Збаўленне.

Сама любоў Ён, святасць, прастата!

*Гучыць калядны спеў «Ціхая ноч» (першы куплет):*

Ціхая ноч, святая ноч,
Спіць усё, спіць даўно,
Толькі Маці святая усцяж
Ціха ў яслях люляе Дзіця:
— Спі, Сыночак малы,
Люлі, люлі, спі.

**Вядучы:** Ціхая ноч, святая…
Паслухайце цішыню!
Пан Бог нам Хрыста пасылае,
Каб збавіць усю Зямлю.

*На другім плане — стаенка, у ёй — Дзева Марыя, св. Юзаф, Дзіцятка Езус у яслях.*

**1-ы вучань:** Марыя-Дзева Збаўцу нарадзіла.
Яна калыша ў яслях Немаўля.
Над Віфлеемам Зорка засвяціла
І паказала да Збаўлення шлях.

Дзіця святое — Божы Сын адзіны,
Што бедна нарадзіўся у хляве,
Ён у душы людской свой след пакінуў
І слова Божае між нас жыве.

**2-гі вучань:** І сёння, у святы калядны вечар,
Кладзём мы жменю сена пад абрус
Як сімвал: будзем помніць вечна,
Што ў стайні быў народжаны Ісус.

Ён збавіць душы нашыя ад смерці
На свет прыйшоў, нам шчасце падарыў.
І свечка на стале гарыць, не меркне.

Няма святлей каляднае пары!

*На сцэне — тры пастушкі.*

*Анёл Пана з'яўляецца перад пастушкамі. Яны палохаюцца.*

**Анёл:** Не бойцеся, бо я вам абвяшчаю

Аб нараджэнні Езуса Хрыста,

Які для ўсіх людзей Збаўленнем стане.

Навек адступіць смерці цемната!

**1-ы пастушок:** Якое незвычайнае свячэнне!

Якую радасць аб'явіў Анёл!

Ён нам сказаў пра Збаўцы нараджэнне —

І Зорка асвяціла ўсё вакол.

**2-гі пастушок:** Так, гэта радасць для ўсяго народа

З гораду Давіда к нам прыйшла:

Душа не знікне, будзе жыць заўсёды —

Вось чаму Неба поўнае святла!

**3-ці пастушок:** Хутчэй хадзем за Зоркай, за свячэннем

Туды, дзе нарадзіўся Хрыстус Пан,

Бо Ён сваім дзівосным нараджэннем

Як Збаўца наш быў Госпадам паслан.

*Пастушкі адыходзяць.*

*Гучыць песня «Зорка бэтлеемска» (два куплеты):*

Зорка бэтлеемска над зямлёю ззяе,

Радасную вестку людзям абвяшчае.

Не спі, абудзіся! Хрыстус нарадзіўся!

З неба радасць прамяніцца,

Будзем весяліцца!

Промень Божай ласкі на зямлю праліўся,

Каб табе даць шчасце, Збаўца нарадзіўся.

Не спі, абудзіся! Хрыстус нарадзіўся!

З неба радасць прамяніцца,

Будзем весяліцца!

*Выходзяць тры каралі.*

**Каспар:** Мы — каралі з Усходу,
За Зоркай мы ідзём,
Збавіцелю народа
Дары свае нясём.

**Мельхіёр:** Мы золата, што маем,
Нясём для Караля,
Які народ наш збавіў,
І рада ўся Зямля.

**Бальтазар:** Кадзіла, што для Бога,
З сабой Яму нясём.
Ідзём прамой дарогай —
За Зоркай мы ідзём.

**Каспар:** Алей такі духмяны
Разносіць тут свой пах,
Для Збаўцы мы з пашанай
Трымаем у руках.

**Вядучы:** Цар Ірад, што знішчэння
Для Езуса жадаў,
Ён, каралёў сустрэўшы,
Так ім зрабіць сказаў…

**Цар Ірад:** Ідзіце і шукайце
Вы Божае Дзіця
Ды мне паведамляйце!
Хачу ж пабачыць я
Дзіцятка, Збаўцу свету,
Паклон Яму аддаць,
Каб пра падзею гэту
Усюды абвяшчаць.

**Мельхіёр:** Ды толькі сон мне сніцца
І кажуць мне ў сне:
— Цар Ірад не гасцінцы
Для Езуса нясе —
Дзіцятка хоча знішчыць!
Не йдзіце да яго!
Зусім дарогай іншай
Да роднага свайго
Ідзіце каралеўства!

**Бальтазар:** І мы ідзём назад.
Дзіцятка, Збаўцу свету,
З нас кожны бачыць рад.
А Ірада-зладзея
Не хочам бачыць мы,
Забойцу, ліхадзея,
Цара няпраўды, цьмы!

*Тры каралі адыходзяць.*

*Па сцэне кружацца сняжынкі (3 дзяўчынкі ў пышных белых сукенках).*

**Сняжынкі** (*гавораць разам*):
Мы — лёгкія сняжыначкі,
Над полем мы ляцелі,
Ды ў танцы закружыліся,
Бо прывітаць хацелі
Мы танцам разам з вамі
Святое Немаўля,
Якое сёння славяць
І неба, і зямля.

*Сняжынкі танцуюць.*

*Гучыць калядны спеў:*

Неба і Зямля, Неба і Зямля
Радасна співаюць.
Анёлы свету, анёлы свету
Дзіва абвяшчаюць.

Хрыстус нарадзіўся, Бог аб’явіўся,
Анёлы співаюць, пастушкі іграюць —
Дзіва, дзіва абвяшчаюць.

**1-ы вучань:** Святлее святасцю душа,
Святлее Божым Нараджэннем,
Малітвай, спевам-праслаўленнем,
Святлее святасцю душа.

**Вядучы:** Усіх сягоння хочам
Сабраць у карагод.
Святло каляднай ночы
Святкуе наш народ!

*Усе ўдзельнікі выходзяць на сцэну, утвараюць кола і співаюць (або дэкламуюць):*

Ты, найярчэйшая між зор,
Свяці нам, Зорка Віфлеема!
І пакажы нам шлях да Неба
Ты, найярчэйшая між зор!

*Заслона.*